3. Бахтин М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин; сост. С. Г. Бочаров. – 2-е изд. – М.: Искусство, 1979. – 424 с.
4. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання: Беларуская літаратура: V – XI класы. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі. – 2010. – 128 с.; Учебная программа для общеобразовательных учреждений с белорусским и русским языком обучения: Русская литература: V – XI классы. – Минск: Национальный институт образования. – 2009. – 128 с.

**Рашэтнікава Н. Б. (Мінск)**

## ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СТАРШЫХ КЛАСАХ

Традыцыйна ў старшых класах агульнаадукацыйнай школы вывучаўся курс беларускай літаратуры на гістарычнай аснове. Упершыню гісторыка-літаратурны курс з’явіўся ў школьных праграмах у другой палове 20-х гадоў XX стагоддзя і быў вызначаны выдатным беларускім метадыстам прафесарам І.І. Замоціным як сістэматычны курс літаратуры. “Сістэматычны курс літаратуры, – пісаў навуковец, – трэба разумець, як агляд у гістарычным аспекце ці ўсяе даннае літаратуры ў цэлым ці якое небудзь-яе часткі – раздзелу, эпохі, кірунку, літаратурнае групы, таго ці іншага пісьменніка” [1, с. 51].

Асноўнай задачай гісторыка-літаратурнага курса было падрыхтаваць старшакласнікаў па беларускай літаратуры за курс сярэдняй школы, гэта значыць, сфарміраваць у іх неабходныя веды і ўменні. Менавіта таму лічым недахопам вызначэнне ў школьнай праграме для старшых класаў гісторыка-храналагічнага прынцыпа я кгалоўнай ідэі канструявання матэрыялу па беларускай літаратуры. У “Тлумачальнай запісцы” да праграмы па беларускай літаратуры на 2010/2011 навучальны год падкрэслена: “Гісторыка-храналагічны прынцып канструявання зместу літаратурнай адукацыі ў IX-XI класах паспрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з’яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплываў у творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу” [2, с. 12]. Фактычна тое ж самае можна прачытаць у “Тлумачальнай запісцы” да школьных праграм па беларускай літаратуры за 2006 год: “Гісторыка-храналагічны прынцып канструявання зместу літаратурнай адукацыі ў IX-X класах паспрыяе фарміраванню гістраычнага падыходу да літаратурных з’яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплываў у творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу” [3, с. 16].

Як бачым, адны і тыя ж падыходы вызначаны як для выкладання беларускай літаратуры ў старшых класах (2010 год), так і для няпоўнай сярэдняй школы, так званага базавага ўзроўню, што неправамочна.

Менавіта таму мы асвятляем асноўныя функцыянальныя аспекты выкладання беларускай літаратуры ў старшых класах, зыходзячы з даўно ўсталяваных у методыцы выкладання літаратуры і ў школьнай практыцы падыходаў.

Старшыя класы – заключная ступень літаратурнай адукацыі, дзе айчынная літаратура вывучаецца на гістарычнай аснове як складнік гісторыка-літаратурнага працэсу. Згодна Канцэпцыі літаратурнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (1991) беларуская літаратура ў агульнаадукацыйнай сярэдняй школе вывучаецца ў яе цэласнасці, завершанасці, у кантэксце сусветнай літаратуры. Асвятляюцца перадумовы і характар узнікнення, заканамернасці і своеасаблівасць літаратурных родаў, віадў і жанраў у розныя гістарычныя эпохі, узаемадачыненні беларускай літаратуры з літаратурай іншых народаў, цяперашні стан развіцця айчыннай літаратуры і перспектывы.

Згодна даследаванняў беларускіх навукоўцаў, беларускай літаратура ўзнікла ў эпоху Сярэднявечча, у той час, як літаратурныя творы іншых народаў свету маюць узрост некалькі тысяч гадоў, менавіта таму ў школьнай праграме па белраускай літаратуры павінна быць упісана ў сусветны літаратурны працэс, такім чынам мы нашмат лепей будзем разумець спецыфіку сваёй нацыянальнай мастацкай культуры і літаратуры.

Гісторыка-літаратурны курс традыцыйна пачынаецца з міфалогіі і фальклору. Міфы і вусная народная творчасць узніклі задоўга да пісьмовай літаратуры і распаўсюдзіліся ў выглядзе паданняў, легенд, замоў, казак, песень і інш.

У фальклорных творах увасобіліся ідэалы народа, яго працоўны вопыт, у іх адлюстраваліся асноўныя гістарычныя падзеі. Фальклор паўплываў на станаўленне беларускай мастацкай літаратуры, некаторыя літаратурныя творы фальклырызаваліся і пераходзілі ў ананімнае вуснае бытаванне.

Своеасаблівасць старажытнай беларускай літаратуры і літаратуры XIX стагоддзя ў тым, што творчасць асобных пісьменнікаў мае адносіны да дзвюх нацыянальных літаратур (Сімяон Полацкі, Адам Міцкевіч і інш.). Аднак аснову курса беларускай літаратуры на гістарычнай аснове складаюць творы, напісаныя на беларускай мове.

Сапраўдным узлётам нацыянальнай беларускай літаратуры з’яўляюцца творы, напісаныя ў XX стагоддзі, у прыватнасці ў нашаніўскі перыяд. У гэты час у беларускую літаратуру прыйшлі

выдатныя творцы: Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч і інш. Пазней, у савецкі час шэраг знакамітых пісьменнікаў, класікаў айчыннай літаратуры, папоўнілі Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Іван Мележ, Андрэй Макаёнак, Іван Шамякін, Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін і інш. Іх творы, бясспрэчна, з'яўляюцца вяршыннымі дасягенннямі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя, і яны павінны складаць змест літаратурнай адукацыі ў агульнаадукацыйнай сярэдняй школе.

Гісторыка-літаратурны курс у старшых класах не толькі павінен адпавядаць прынцыпам навуковасці, сістэмнасці гістарызму і адпавядаць патрабаванням узроставай псіхалогіі. Так, для ранняга юнацтва характэрна цікавасць да свету і чалавека ў свеце. Цэнтральная праблема гэтага ўзросту – я і свет. Гэта эпоха сувязей, усведамлення прычын і вынікаў. Старшакласнікаў хвалююць маральныя, сацыяльныя і эстэтычныя праблемы, іх цікавіць цэласная карціна свету. У гэты перыяд развіцця школьнікаў паглыбляецца ўвага вучняў да мастацкай формы твора, унутраных сувязей тэкста. У чытача-школьніка з'яўляецца жаданне ўзняцца над тэкстам, убачыць яго з новых пазіцый, з вышыні ўзнятых праблем. Адсюль неабходнасць канцэптуальнага падыходу да вывучэння як асобных твораў, так і творчасці пісьменніка ў цэлым.

Зварот да класічных твораў беларускай літаратуры патрабуе ад настаўніка і вучняў вычлянення ў тэксце значных для юнакоў і дзяўчат маральных і эстэтычных праблем. Мастацтва выкладання заключаецца ў знаходжанні таго варыянта метадычнай сістэмы, тых пытанняў і заданняў, якія адпавядаюць агульнаму і літаратурнаму развіццю школьнікаў, неабходныя кожнаму канкрэтнаму вучню.

Новым этапам літаратурнай адукацыі ў старшых класах з'яўляецца засваенне вучнямі такіх тэарэтыка-літаратурных паняццяў, як літаратурны напрамак, метад, літаратурная эпоха, старшакласнікі атрымліваюць першапачатковыя веды пра сусветны літаратурны працэс. Эпохі Сярэднявечча, Адраджэння, Барока, Асветніцтва, Рамантызму і інш. асэнсоўваюцца вучнямі на ўроках літаратуры як спадчынапрыемцы і антыподы. Тое ж можна сказаць і пра асноўныя метады і напрамкі. Настаўніку важна паказаць як сістэма "правілаў" кожнага метаду і напрамку непазбежна вар'іруецца ў творчасці пісьменніка.

Як вядома, гісторыка-літаратурны курс складаецца з аглядавых і манаграфічных тэм. Сярод аглядавых тэм вылучаюцца панарамныя, што прысвечаны эпохам у развіцці літаратуры і культуры. Як правіла, такія тэмы чаргуюцца ў школьнай праграме з манаграфічнымі тэмамі, прысвечанымі жыццю і творчасці выдатных мастакоў слова. Чаргаванне агульных і буйных планаў з асэнсаваннем канкрэтнага тэкста і складае

метадычную аснову вывучэння беларускай літаратуры ў старшых класах.

У цэнтры манаграфічнай тэмы – пісьменнік і яго творчасць, згодна традыцыі, адзін ці некалькі твораў вывучаюцца тэкстава, а астатнія, прапанаваныя праграмай, – аглядава. Матэрыялы пра жыццё і творчасць пісьменніка часцей за ўсё прадстаўлены ў падручніку або вучэбным дапаможніку ў выглядзе нарыса, работа над біяграфіяй мастака слова на ўроку літаратуры зарыентавана на разуменне школьнікамі значэння творчасці пісьменніка ў гісторыі беларускай літаратуры, у блізкароднасных літаратурах, сусветнай літаратуры. Форма правядзення ўрокаў-біяграфій у старшых класах разнастайная, настаўнікамі-славеснікамі назапашаны значны вопыт, які дастаткова поўна апісаны ў метадычнай літаратуры. Гутарка ідзе пра ўрокі-лекцыі, урокі-канферэнцыі, урокі тыпу завочнай экскурсіі, а таксама делавой гульні. Адзін з асноўных недахопаў арганізацыі ўрокаў-біяграфій – недастатковая ўвага да асобы пісьменніка, да яго творчай індывідуальнасці, да асаблівасцей жыццёвага і творчага шляху. Менавіта таму карыснай з’яўляецца работа настаўніка і вучняў з мемуарнай і эпісталярнай спадчынай творцы. Сучаснаму вучню неабходна растлумачыць, што ў многіх людзей амаль усё XX стагоддзе прайшло пад эгідай перапіскі, а мемуары пісьменніка – гэта яркія старонкі біяграфіі нашай краіны і ў значнай ступені з’яўляюцца ключом да разумення канцэптуальнага асвятлення пісьменнікам свету і чалавека. Матэрыялы для ўрока-біяграфіі па беларускай літаратуры знайсці нескладана, таму што кожны са знакамітых пісьменнікаў мае эпісталярную спадчыну і многія – мемуары, успаміны, дзённікавыя запісы.

Творчасць мастака слова ўяўляе сабой сістэмнае адзінства, таму што ў кожнага творцы сваё кола тэм, праблем, ідэй і вобразаў. Ва ўсіх творах пісьменніка выразна адлюстравалася яго мастацкая індывідуальнасць. Пры планаванні як аглядавай, так і манаграфічнай тэмы магчымы розныя варыянты, вучням можна прапанаваць апераджаючыя і спадарожныя пытанні і заданні, якія дазволяць актывізаваць пазнавальную дзейнасць школьнікаў.

Структура манаграфічнай тэмы агульнавядомая: урок-біяграфія, тэкставае і аглядавае выучэнне твораў, абагульненне. Аглядавыя тэмы, як ужо падкрэслівалася вышэй, маюць пэўную варыятыўнасць, аднак пры гэтым і адзінства, бо асноўная задача – паказаць перспектыву работы над вызначаным праграмай значным этапам у гісторыі айчыннай мастацкай культуры, а таксама сусветнай.

Асноўнай адукацыйнай задачай гісторыка-літаратурнага курса беларускай літаратуры ў старшых класах з'яўляецца фарміраванне ў вучняў аналітычных і літаратурна-творчых ведаў і ўменняў, скіраваных на агульнае і літаратурнае развіццё. Не існуе іншага шляху развіцця ў школьнікаў літаратурных здольнасцей, без якіх няма творчай асобы, здольнай вырашаць значныя інтэлектуальныя праблемы.

**Літаратура**


1. Замоцін І.І. Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні. Менск, 1928.
2. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V-XI класы. Мінск, 2010.
3. Праграмы для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V-XI класы. Мінск, 2006.



**Рычкова Л. В. (Гродна)**


## ПЛЮРАЛІНГВАЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ: МІФ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?

Большасць дзяржаў Еўропы адрознівае выключная этнічная і моўная разнастайнасць. Беларусь не з'яўляецца выключэннем у гэтым сэнсе, а, наадварот, падкрэслівае правіла. На тэрыторыі сучаснай Беларусі ўжо некалькі стагоддзяў сумесна пражываюць і таму лічацца аўтахтоннымі 8 этнасаў: беларусы, рускія, палякі, украінцы, татары, літоўцы, рома (цыганы), яўрэі. Па звестках афіцыйных перапісаў насельніцтва, прадстаўнікі больш за 140 нацыянальнасцей пражываюць на Беларусі сёння. Пры гэтым на Беларусі назіраюцца ўсе вядомыя тыпы размеркавання носьбітаў моў: 1) транснацыянальнае размеркаванне (у выпадку рускіх, палякаў, украінцаў, літоўцаў); 2) геаграфічна абмежаваныя лакальныя супольнасці (татары і, да некаторай ступені, яўрэі і рома); 3) імігранты (акрамя прадстаўнікоў аўтахтонных этнасаў, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей з'явіліся на Беларусі ў выніку пазнейшай міграцыі). Паскарэнне глабалізацыі і непазбежнай пры гэтым міграцыі вядзе да імклівага росту полікультурных дыяспар і актуалізуе праблемы нацыянальнай і / або моўнай ідэнтычнасцей, а таксама індывідуальнага плюралінгвізму (поліглатызму).

На тэрыторыях моўных (і этнічных) кантактаў, дзе пражываюць разам прадстаўнікі нацыянальных меншасцей и нацыянальнай большасці, мовы з'яўляюцца сродкам самавыражэння и самавызначэння - рысай культурнай ідэнтычнасці, часта роўнай этнічнай ідэнтычнасці. Больш за тое, мова часта выступае ў якасці сімвалу нацыянальнага (дзяржаўнага) адзінства і ідэнтычнасці. На тэрыторыях моўных кантактаў захаванне або змена мовы звычайна залежаць ад ступені